# Бітва пад Воршай

(гістарычная песня)

Рашуча

16-17 ст.




У нядзельку параненьку
Рана параненьку
Узыйшло сонейка хмарненька
Сонейка хмарненька.

Узыйшло сонейка над борам
Сонейка над борам
Па-над Селецкім таборам
Селецкім таборам .

А ў таборы трубы граюць
Трубы, трубы граюць
Да ваярскай зазываюць
Рады зазываюць.

Сталі Раду адбываці
Раду адбываці
Адкуль Воршу здабываці
Воршу здабываці.

А ці з поля, а ці з лесу
Поля, а ці з лесу
А ці з рэчкі невялічкі
Рэчкі невялічкі.

А ні з поля, а ні з лесу
Поля, а ні з лесу
Толькі з рэчкі невялічкі
Рэчкі невялічкі.

У нядзельку параненьку
Рана параненьку
Узыйшло сонейка хмарненька
Сонейка хмарненька.

Сталі хлопцы пяцігорцы
Хлопцы пяцігорцы
Каля рэчкі на прыгорцы
Рэчкі на прыгорцы.

Гучаць разам з самапалаў
Разам з самапалаў
З сямі/пятых ад запалаў
Пятых ад запалаў.

Б'юць паўсоткаю з гарматаў
Соткаю з гарматаў
Б'юць з гарматаў ды заўзята
Б'юць ды б'юць заўзята.

Масква стала наракаці
Стала наракаці
Места Воршу пакідаці
Воршу пакідаці.

Слава Воршы ўжо ня згорша
Слава ўжо ня згорша
Слаўся, слаўся князь Астрожскі
Слаўся князь Астрожскі.

Copyright © Stary Olsa